**Палітычная гісторыя**

Аксана ЛЕПЕШ

# Камітэт заходніх губерняў у Расійскай імперыі другой чвэрці XIX ст.



*ЛЕПЕШ Аксана Васільеўна — дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук. Нарадзілася ў г. Мінск. У 2001 г. закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 2004 г. — аспірантуру БДУ. Займаецца вывучэннем палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў другой чвэрці XIX ст. Аўтар 15 навуковых публікацый.*

Час праўлення расійскага імператара Мікалая I (1825—1855 гг.) стаў часам пошуку самабытнага шляху развіцця Расійскай імперыі на аснове "тэорыі афіцыйнай народнасці", якая спалучыла ў сабе тры ідэйныя элементы — самадзяржаўе, праваслаўе і народнасць. Ва ўмовах, калі на заходніх тэрыторыях імперыі адбываліся рэвалюцыйныя ўзрушэнні, правячая эліта лічыла, што гэта тэорыя можа садзейнічаць стабілізацыі сітуацыі ў дзяржаве і правядзенню рэформ без хваляванняў. Афіцыйная ідэалогія павінна была даць тэарэтычнае абгрунтаванне непарушнасці самадзяржаўнай улады, спрадвечнасці і трываласці дзяржаўнага ладу, з'явіцца бар'ерам для пранікнення ў краіну рэвалюцыйных настрояў. У той жа час кансерватыўная па сваёй сутнасці, яна не прадугледжвала поўнай адмовы ад рэфармавання. У маніфесце аб здзяйсненні прысуду над дзекабрыстамі Мікалай I аб'явіў, што будзе прыхільна прымаць прапановы аб паляпшэнні стану дзяржавы[1]. У складанай унутрыпалітычнай сітуацыі гэтая лінія стала базіравацца на ўзнаўленні аўтарытэту самадзяржаўя і ўмацаванні пазіцый праваслаўнай царквы. Увядзенне ў ідэалагічную трыяду слова "народнасць" павінна было дэклараваць змены ўрадавага курсу і ў адносінах да прыгоннага сялянства.

Ва ўмовах нарастаючага бюракратызму і перагружанасці дробнымі справамі органы ўлады Расійскай імперыі ўжо былі не ў стане аператыўна вырашаць важнейшыя пытанні заканадаўчага і адміністрацыйнага характару. Праекты накіроўваліся то ў адно, то ў іншае міністэрства, у якіх накопліваліся тысячы нявырашаных спраў. Яшчэ больш складаная сітуацыя была з разглядам праблем, якія ўзнікалі на ўскраінах імперыі, дзе існавала "асаблівая" сістэма кіравання з "асаблівым" адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам і "асаблівымі" пасадамі. Каб разабрацца ў сітуацыі, ураду прыходзілася выдаткоўваць шмат часу, далучаць да рашэння праблем як вышэйшых саноўнікаў, так і мясцовае кіраўніцтва. Таму ўзнікла ідэя падмяніць цяжкую і косную дзяржаўную машыну надзвычайнымі органамі — сакрэтнымі камітэтамі. Менавіта яны надавалі дзяржаўнаму апарату Расійскай імперыі неабходную ступень гнуткасці.

Канкрэтнае становішча таго ці іншага камітэта ў сістэме ўстаноў Расійскай імперыі вызначалася яго складам (па пасадах і па персанальных прызначэннях), арганізацыяй справаводства і характарам адносін кіраўніка гэтага камітэта з імператарам.

Рэалізацыя новай ідэалогіі прадугледжвала уніфікацыю ладу жыцця нацыянальных ускраін імперыі з яе ўнутранымі губернямі. Для рэалізацыі гэтай палітыкі ў другой чвэрці XIX ст. ствараліся тэрытарыяльныя камітэты: Першы і Другі Сібірскія (1821—1838 гг.,

Репозиторий БНТУ

1852—1864 гг.), Камітэт заходніх губерняў (1831—1848 гг.), Камітэт па справах Царства Польскага (1831—1841 гг., 1864—1881 гг.), Каўказскі камітэт (1833—1882 гг.). Яны былі закліканы ліквідаваць адасобленасць Сібіры, Беларусі, Літвы, Правабярэжнай Украіны, Польшчы, Каўказа ад унутраных губерняў Расійскай імперыі і садзейнічаць уніфікацыі іх адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання з цэнтральнымі губернямі. Кожны з пералічаных камітэтаў дзейнічаў у спецыфічных для свайго краю ўмовах, але мэты ў іх былі агульныя.

Адзначым, што існаванне камітэтаў па кіраванню асобнымі ўскраінамі — спецыфічная рыса функцыяніравання дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі другой чвэрці XIX ст. Гэтыя камітэты, якія нярэдка выконвалі ролю своеасаблівых тэрытарыяльных урадаў, здзяйснялі ў адносінах падведамасных ім ускраін функцыі законадарадчых інстанцый і органаў нагляду. У асноўным яны ўяўлялі сабой нешматлікія, часта надзеленыя шырокімі паўнамоцтвамі аб'яднанні, якія складаліся з асабліва давераных Мікалаю I вышэйшых саноўнікаў. Боязь урада, што дзейнасць гэтых камітэтаў можа выклікаць у грамадстве якія-небудзь надзеі на перамены, абумовіла іх сакрэтнасць.

Як правіла, такія камітэты не мелі сваіх канцылярый, а іх справаводства вёў у спецыяльным журнале запрошаны чыноўнік. Пасля таго як імператар прачытваў і адабраў справаводчыя дакументы камітэта, іх змест у форме "высочайших повелений" паведамляўся ў Дзяржаўны савет, Камітэт міністраў, Сенат, адпаведныя міністэрствы. У выніку ўказы, першапачаткова распрацаваныя ў камітэтах, выходзілі з грыфам таго ведамства, якое іх канчаткова зацвярджала, альбо за асабістым подпісам імператара. Безумоўна, тэрытарыяльныя і іншыя сакрэтныя камітэты звужалі кампетэнцыю вышэйшых органаў улады.

Характэрнай асаблівасцю работы гэтых камітэтаў з законадарадчымі функцыямі была распрацоўка іх мерапрыемстваў у вузкім бюракратычным коле. Каб правесці апрабацыю некаторых ідэй, схаваць мяркуемыя рашэнні не толькі ад шырокіх колаў грамадства, але і ад часткі вярхоў кіравання, неабходна было надаць камітэтам асобы статус. Большасць з іх існавала нядоўгі час, хоць былі і выключэнні.

Тэрыторыя заходніх губерняў (Валынская, Віленская, Віцебская, Гродзенская, Кіеўская, Ковенская, Магілёўская, Мінская, Падольская) не была выключэннем. У той жа час агульнадзяржаўныя мерапрыемствы ў Заходнім краі мелі сваю спецыфіку з-за падаўлення паўстання 1830—1831 гг. Дзейнасць урада ў адносінах да дадзенай часткі імперыі дыктавалася ў 1830—1840-я гг. неабходнасцю ўмацавання заходніх граніц і выкаранення рэвалюцыйнага ўплыву з Захаду, у тым ліку з Польшчы[2]. Паўстанне 1830—1831 гг. паказала, што заходняя частка дзяржавы не толькі чужая для Расійскай імперыі, але, больш за тое, варожа настроеная. Агульная колькасць паўстанцаў на тэрыторыі Беларусі склала ў перыяд з красавіка па лістапад 1831 г. каля 15 тыс. чалавек. Асноўнымі рухаючымі сіламі паўстання з'яўляліся прадстаўнікі шляхты (56,5%). Значны працэнт ад усіх удзельнікаў складалі сяляне (27,7%)[3]. Такое масавае непадпарадкаванне сур'ёзна занепакоіла ўрад, і ён вырашыў заняцца выпраўленнем сітуацыі ў заходніх губернях.

Для выпрацоўкі агульнадзяржаўных мерапрыемстваў у адносінах да гэтай тэрыторыі 16 верасня 1831 г. па "вуснаму загаду" Мікалая I быў створаны "Комитет, учрежденный для рассмотрения разных предположений по губерниям, от Польши возвращенным"[4]. У розных крыніцах ён сустракаецца і пад іншымі назвамі: Камітэт заходніх губерняў, Камітэт па справах заходніх губерняў, Заходні камітэт, Камітэт па справах вернутых ад Польшчы губерняў. Але часцей за ўсё выкарыстоўвалася назва Камітэт заходніх губерняў. Пра сакрэтны характар камітэта сведчыць вусны загад аб яго стварэнні і адсутнасць якіх-небудзь звестак у Поўным зборы законаў Расійскай імперыі і ў штогадовым Адрас-календары.

Склад Камітэта фарміраваўся па пасадзе: старшыня — старшыня Камітэта міністраў (адпаведна Дзяржаўнага савета), члены — галоўны кіраўнік Паштовага дэпартамента, галоўны кіраўнік духоўнымі справамі замежных веравызнанняў, міністры ўнутраных спраў, фінансаў, юстыцыі, пазней таксама замежных спраў і дзяржаўных маёмасцей, шэф жандараў, міністр — статс-сакратар па справах Царства Польскага і обер-пракурор Сінода. Падобным шляхам (па пасадзе) фарміраваліся, напрыклад, Першы і Другі Сібірскія камітэты, чаго нельга сказаць пра Камітэт па справах Царства Польскага. Там кіраўнікі прызначаліся асабіста імператарам[5].

Камітэт заходніх губерняў дзейнічаў як самастойная ўстанова, але меў непасрэднае дачыненне да Камітэта міністраў, паколькі да яго заснавання большасць з пастаўленых яму задач вырашаў Камітэт міністраў. Цалкам магчыма, што і ўзнік ён па прапанове Камітэта міністраў. З шасці асоб, якія ў 1831 г. уваходзілі ў склад Камітэта заходніх губерняў, толькі адзін (М.М.Навасільцаў) не быў тады членам Камітэта міністраў. Спачатку гэтыя камітэты мелі розныя канцылярыі, але ў лістападзе 1840 г. канцылярыі былі аб'яднаны. З гэтага часу справаводства па Камітэту заходніх губерняў было ўскладзена на Трэцяе аддзяленне канцылярыі Камітэта міністраў, а кіраўніку справамі Камітэта міністраў за вядзенне спраў па Камітэту заходніх губерняў у год выплачвалася па 1 500 руб. серабром[6]. Цікава, што да моманту аб'яднання дзвюх канцылярый у канцылярыі Камітэта заходніх губерняў не было ніводнай нявырашанай справы. Гэта дазваляе гаварыць пра аператыўнасць работы Камітэта.

За 17 гадоў існавання склад Камітэта заходніх губерняў неаднаразова мяняўся (як правіла, у сувязі са смерцю яго членаў). Старшынёй камітэта з моманту яго заснавання быў прызначаны В.П.Качубей, які ўзначальваў Дзяржаўны савет і Камітэт міністраў. Членамі Камітэта з'яўляліся: міністр фінансаў Я.Ф.Канкрын, папячыцель Віленскай навучаль-



Рэпазіторый БНТУ

най акругі, член Дзяржаўнага савета М.М.Навасільцаў, міністр унутраных спраў А.А.Закрэўскі, галоўны кіраўнік духоўнымі справамі замежных веравызнанняў Д.М.Блудаў, кіраўнік міністэрства юстыцыі Д.В.Дашкаў. Першапачаткова справаводства па Камітэту заходніх губерняў узначальваў кіраўнік справамі Камітэта міністраў М.А.Корф. Гэта было асабістае пажаданне імператара, аб'яўленае В.Качубеем яшчэ напярэдадні арганізацыі Камітэта — 12 верасня 1831 г. У наступным М.Корф так гаварыў пра сваю работу ў Камітэце: "Вядомы ўказ 1831 г. аб польскай шляхце, маніфест аб ганаровым грамадзянстве і мноства актаў, выдадзеных у той час па розных галінах адміністрацыі, асабліва ў адносінах да ўладкавання Заходняга краю — было творчасцю майго пяра"[7]. Справу М.Корфа працягнуў у 1840 г. М.І.Бахцін.

Пазней членамі Камітэта ў розны час былі вядомыя расійскія саноўнікі: В.М.Панін, П.Д.Кісялёў, А.Г.Строганаў, І.В.Васільчыкаў, А.Х.Бенкендорф, А.І.Чарнышоў, Л.А.Пяроўскі, А.Ф.Арлоў, Ф.П.Врончанка і іншыя. На пасяджэнні Камітэта запрашаліся губернатары і генерал-губернатары заходніх губерняў — Д.Г.Бібікаў, М.М.Мураўёў, М.М.Хаванскі, Ф.Я.Міркавіч. З першапачатковага складу членаў камітэта апошні журнал падпісаў толькі Д.Блудаў. Усяго было праведзена 143 пасяджэнні Камітэта, на якіх разгледжана больш за 700 пытанняў.

Найбольш часта Камітэт заходніх губерняў збіраўся ў 1831—1833 гг. (38 разоў) і ў 1839—1841 гг. (42 разы), што было звязана з унутрыпалітычнымі абставінамі ў краі. У 1831—1833 гг. асноўныя намаганні Камітэта былі накіраваны на выпрацоўку мерапрыемстваў, якія б узнавілі парадак у рэгіёне пасля паўстання і садзейнічалі хуткаму збліжэнню заходніх губерняў з цэнтральнымі. У 1839—1840 гг. на тэрыторыі заходніх губерняў зноў узнікла пагроза ўраду — была раскрыта змова Шымана Канарскага. Гэта пераканала імператара Мікалая І у тым, што нельга марудзіць з канчатковым праектам уключэння заходніх ускраін у структуры імперскага кіравання. Невыпадкова, што ў гэтыя гады Камітэт заняўся распрацоўкай указаў адносна ўвядзення на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны расійскага заканадаўства.

Складанасць у вывучэнні дзейнасці Камітэта заходніх губерняў заключаецца ў тым, што ён працаваў без плана. Павестка дня поўнасцю залежала ад паступлення ў канцылярыю розных лістоў, запісак, адносін, нават выпадковых. Як правіла, тое ці іншае пытанне ў Камітэце ўздымалі міністры ці губернатары. Розныя прапановы з рэзалюцыяй імператара Мікалая І — "разгледзіць у Заходнім камітэце" — спачатку абмяркоўваліся толькі ў агульных рысах, а затым накіроўваліся ў адпаведнае ведамства. Складзены ў ведамстве праект ужо ўважліва разглядаўся ў Камітэце. Далей журнал з заключэннем Камітэта паступаў на зацвярджэнне імператара, звычайна мінуючы Дзяржаўны савет. Некаторыя праекты, аднак, праходзілі праз Камітэт міністраў, што тлумачыцца наяўнасцю агульнага старшыні двух камітэтаў, а затым і канцылярыі. Імператар Мікалай І уважліва сачыў за дзейнасцю Камітэта, хутка і ўважліва вывучаў журналы яго пасяджэнняў, пісаў на палях свае рэзалюцыі.

Адзначым, што ў Камітэта заходніх губерняў быў свайго роду папярэднік, які ў справаводчых журналах мае назву Асобага камітэта. Ён працаваў у складзе А.Н.Галіцына (старшыня), Д.Блудава і Д.Дашкава (члены). Дакладная дата стварэння гэтага камітэта невядома. Верагодна, што сфарміравалі яго яшчэ падчас паўстання 1830—1831 гг. для разгляду прапаноў мясцовых кіраўнікоў адносна ўзнаўлення парадку ў заходніх губернях.

Першая задача, якая стаяла перад Асобым камітэтам — разгляд данясення віленскага губернскага пракурора Р.Г.Дапельмаера аб стане Віленскай губерні і складанне новага часовага праекта кіравання губерняй. Імператар настойваў, каб са складу Віленскай губерні вычленілі 4 "самагіцкія" паветы (Шавельскі, Цяльшэўскі, Расіенскі, Панявежскі), "у якіх асабліва распаўсюдзіліся злачынныя замахі мяцежнікаў"[8], накіравалі туды сенатара, які ведаў польскую мову, і неабходную колькасць надзейных "рускіх" чыноўнікаў для замены іншых. Члены Асобага камітэта палічылі такую прапанову Мікалая І нерэальнай. Яны адзначалі, што немагчыма аддзяліць гэтыя паветы і "знайсці раптам дастатковую колькасць надзейных чыноўнікаў і здольных людзей для служэння ў разладжаным абсалютна краі"[9]. Неабходным у такой сітуацыі членам Асобага камітэта ўяўлялася заснаванне ў Заходнім краі прыстойнага кіравання. Для гэтага трэба было ўвесці ў кожнай губерні і ў кожным павеце такія пасады, якія б спалучалі функцыі ваеннай і грамадзянскай улады. Займаць іх павінны былі ўраджэнцы ўнутраных губерняў імперыі.

Р.Дапельмаер, які красамоўна распісваў удзел у паўстанні і здраду імператару чыноўніцтва Віленскай губерні, настойваў на замене мясцовых чыноўнікаў прысланымі з Расіі. У выніку Асобы камітэт вырашыў накіраваць у губерню па выбранню міністраў некалькіх чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі, якія ведалі польскую мову, на месцы гараднічых, спраўнікаў, казначэяў, страпчых, пісьмаводаў пры абласных і павятовых кіраўніках. Тым, хто згадзіцца заняць гэтыя не вельмі выгадныя пасады, выдавалі звыш "прагонаў" ад 400 да 1 500 руб. асігнацыямі "на пад'ём".

На гэтым жа пасяджэнні члены Асобага камітэта разгледзелі пытанне наконт каталіцкага духавенства, якое таксама актыўна ўдзельнічала ў паўстанні 1830—1831 гг., і выказаліся за карэнную перабудову сістэмы кіравання рымска-каталіцкай царквой у Расійскай імперыі. Яны лічылі неабходным абмежаваць уладу епархіяльных епіскапаў, якія мелі права сачыць за манастырамі і прызначаць прыходскіх святароў. Юрыдычна епархіяльны епіскап судовай улады не меў, а судовыя функцыі выконвала епархіяльная кансісторыя. Аднак члены гэтай кансісторыі прызначаліся непасрэдна епархіяльным епіскапам

Рэпазіторый БНТУ

і фактычна былі пад яго кантролем. На пасяджэнні Асобага камітэта адзначалася, што епіскапы не здолелі арганізаваць такое кіраванне рымска-каталіцкай царквой, якое б поўнасцю задаволіла ўрад, не змаглі выхаваць у асяроддзі духавенства лаяльныя адносіны да існуючага дзяржаўнага ладу. У выніку камітэт прыняў рашэнне ўсталяваць нагляд за дзейнасцю не толькі епіскапаў і членаў кансісторый, але і ўсяго рымска-каталіцкага духавенства з боку мясцовых і павятовых кіраўнікоў, якія абавязаны былі паведамляць пра ўсе парушэнні ў Галоўнае ўпраўленне духоўных спраў замежных веравызнанняў. Асобую актуальнасць набыло пытанне аб сістэме прызначэння прыходскіх святароў. Улады разумелі, што святары з'яўляліся духоўнымі настаўнікамі мясцовага насельніцтва, таму вырашылі падыходзіць да пытання аб іх прызначэнні вельмі акуратна. Члены камітэта адзначалі, што "выбар прыходскіх святароў у гарадах і сёлах важней самаго складу кансісторыі"[10].

Разглядаў Асобы камітэт на сваіх пасяджэннях і сялянскае пытанне. Ужо ў 1830 г. выказвалася думка аб рэгламентацыі павіннасцей памешчыцкіх сялян. Аднак члены камітэта лічылі неабходным апрабіраваць гэтую рэформу ў старасцінскіх і арэндных маёнтках. Праўда, для яе паспяховай рэалізацыі трэба было ўмацаваць пазіцыі праваслаўнага духавенства і прызначыць на кіруючыя пасады чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі, паколькі сяляне "тады будуць знаходзіць больш падпоры і абароны супраць самавольных распараджэнняў сваіх памешчыкаў"[11].

Такім чынам, Асобы камітэт вызначыў асноўныя напрамкі дзейнасці будучага Камітэта заходніх губерняў — пытанні, звязаныя з умацаваннем мясцовай адміністрацыі чыноўнікамі з унутраных губерняў Расіі, арганізацыяй новага кіравання, абмежаваннем уплыву каталіцкай царквы, апекай урада ў адносінах да сялянства. Усе высновы па справах, разгледжаных у Асобым камітэце, увайшлі ў адзін журнал — "всеподданнейший" даклад для імператара Мікалая I[12]. Пазней Камітэт заходніх губерняў неаднаразова звяртаўся да гэтага журнала. Ужо на першым пасяджэнні 16 верасня 1831 г. яго старшыня В.Качубей азнаёміў прысутных з задачамі Камітэта, галоўнай з якіх было вывучэнне дакументаў Асобага камітэта.

Пасля падаўлення паўстання 1830—1831 гг. мясцовыя губернатары і генерал-губернатары прымалі самы актыўны ўдзел у фарміраванні новай палітыкі ўрада ў Заходнім краі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ініцыятарам прыняцця агульных мер у адносінах да заходніх губерняў быў кіеўскі ваенны губернатар П.Ф.Жалтухін[13]. Аднак нам падаецца, што ў першую чаргу неабходна адзначыць магілёўскага, а затым гродзенскага губернатара Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва. У 1830—1831 гг. ён накіраваў у Санкт-Пецярбург дзве асобыя запіскі аб метадах дасягнення пастаўленых урадам мэтаў у заходніх губернях. Спынімся падрабязней на змесце гэтых запісак, таму што работа Камітэта заходніх губерняў пачалася з разгляду запісак М.М.Мураўёва. Нягледзячы на тое, што яго радыкальныя прапановы засталіся без падтрымкі, многія заўвагі губернатара былі прыняты.

Першая "Всеподданнейшая записка могилёвского гражданского губернатора М.Н.Муравьева о нравственном положении Могилевской губернии и о способах сближения оной с Российской империей"[14], датаваная 22 снежня 1830 г., прадпісвала ўраду дзейнічаць па чатырох напрамках:

1. Узмацніць уплыў праваслаўнай царквы, паколькі уніяцтва і каталіцызм з'яўляюцца апорай "мясцовых туземцаў". Да таго ж, уніяцтва служыць асновай для пераходу ў каталіцызм. Для распаўсюджання праваслаўя неабходна зменшыць колькасць каталіцкіх манастыроў, касцёлаў і капліц, схіліць уніятаў у праваслаўе, правесці секулярызацыю часткі як каталіцкіх, так і праваслаўных царкоўных зямель.

2. Правесці палітыку, накіраваную на ўвядзенне рускай мовы ў справаводства. Сам М.Мураўёў здзейсніў гэтую задуму ў 1828 г., калі прапанова яшчэ не была адобрана ўрадам: "З часу кіравання майго Магілёўскай губерняй не прымаюць ні ў губернскім праўленні, ні на маё імя просьбаў, напісаных па-польску"[15].

Падобныя ж ідэі пазней выказваў і Віленскі генерал-губернатар М.А.Далгарукаў. У сваёй справаздачы за 1834 г. ён называў пашырэнне ўжывання рускай мовы ў якасці аднаго з важнейшых сродкаў зліцця заходніх губерняў з Расіяй: "Ва ўсе часы і ва ўсіх дзяржавах свету мова была і будзе непасрэднай зброяй урада для дасягнення ўсіх магчымых мэтаў і намераў. Паўсюдна ў дзяржаве мова, як і пануючае веравызнанне, ... павінны мець перавагі перад мясцовымі дыялектамі. Агульнае ўжыванне пануючай мовы ў дзяржаве паступова збліжае розныя плямёны ... і, нарэшце, злучае іх у адзін народ"[16].

3. Распаўсюдзіць расійскае заканадаўства на заходнія губерні, паколькі "Літоўскі Статут ... цяпер ужо увогуле недастатковы і пастанаўленні яго ... служаць толькі падставай да бясконцых затрымак і заблытанасцей у справах".

4. Умацаваць дзяржаўны апарат чыноўнікамі з унутраных губерняў Расійскай імперыі. Гэтай меры М.Мураўёў надаваў асаблівае значэнне, гаварыў, што ад яе рэалізацыі залежыць поспех усіх вышэйадзначаных мерапрыемстваў: "Пакуль галоўныя ўпраўленні губерні ... будуць складзены з туземцаў і будуць існаваць літоўскія правы, то нельга чакаць поспеху ў выкананні намераў урада".

Другая запіска 1831 г. "Об учреждении приличного гражданского управления в губерниях от Польши возвращённых и уничтожении начал, наиболее служивших к отчуждению от России"[17] дубліравала папярэднюю, але ў ёй больш дэталёва разглядалася пытанне аб кіраванні заходнімі губернямі. М.Мураўёў настойваў на ўмацаванні адміністрацыі ў краі, прызначэнні на большасць пасад рускіх падданых, якім павінна была прадастаўляцца "выгада ў чынах і ўтрыманні". Падтрыманнем спакою ў заходніх губернях да заканчэння карэнных пераўтварэнняў павін-

Рэпазіторый БНТУ

ны былі заняцца вайсковыя аб'яднанні з лёгкай конніцы і невялікай колькасці пяхоты. М.Мураўёў настойліва патрабаваў звярнуць галоўную ўвагу на замену "туземцаў" рускімі чыноўнікамі. Ён лічыў, што мясцовым дваранам неабходна даць магчымасць служыць унутры Расіі, і згаджаўся толькі на тое, каб мясцовыя чыноўнікі захавалі сваіх прадстаўнікоў у грамадзянскіх палатах. У крымінальных палатах, гарадскіх праўленнях, галоўных паліцэйскіх управах, судовых прысутных месцах, губернскіх і павятовых канцылярыях, паштовым ведамстве павінны былі працаваць "карэнныя рускія", якія б залежалі непасрэдна ад губернатара.

У запісцы 1831 г. была выказана прапанова заснаваць асобы камітэт "для единообразного сосредоточения всех распоряжений касательно предстоящих коренных преобразований в сих областях". Гэтым М.Мураўёў фактычна прадказаў узнікненне Камітэта заходніх губерняў.

У 1831 г. Асобы камітэт разгледзеў запіскі М.Мураўёва і падзяліў меркаванні губернатара на тры групы: 1) прапановы, якія трэба неадкладна рэалізаваць; 2) прапановы, якія павінны быць выкананы з цягам часу; 3) прапановы, якія ўжо рэалізоўваюцца. У першую групу ўвайшлі наступныя меры: прызначэнне на свабодныя пасады святароў з унутраных губерняў Расіі, ускладанне на памешчыкаў функцый па падтрыманню праваслаўных цэркваў, забарона каталіцкаму духавенству займацца дамашнім выхаваннем, ліквідацыя духоўных вучылішчаў пры манастырах і замена іх свецкімі, увядзенне выкладання на рускай мове ў навучальных установах, дазвол чалавеку паступаць на грамадзянскую службу толькі ў выпадку зацвярджэння яго ў дваранстве хоць бы дэпутацкімі сходамі.

Другую групу склалі наступныя прапановы: змяншэнне колькасці каталіцкіх манастыроў, адабранне часткі нерухомай маёмасці ў каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, забарона пераходзіць з уніяцтва ў каталіцтва, забарона каталіцкім святарам служыць ва уніяцкіх цэрквах, стварэнне перашкод для схілення памешчыкамі сваіх сялян у каталіцтва, прызначэнне на галоўныя пасады ў губерні надзейных рускіх чыноўнікаў, раздача дзяржаўных зямель у арэнду на працяглы час выхадцам з унутраных губерняў імперыі.

Да тых мер, якія ўжо лічыліся здзейсненымі, члены Асобага камітэта аднеслі ўвядзенне рускай мовы ў справаводства ў адміністрацыйных установах, ліквідацыю дзеяння Статута ВКЛ 1588 г. і распаўсюджванне расійскіх узаконенняў на Віцебскую і Магілёўскую губерні[18].

Паказальна, што Асобы камітэт лічыў жыхароў заходніх губерняў рознымі паміж сабой "паходжаннем, гаворкай і самім духам". Таму яго члены адзначалі, што гэты край "не можа быць прыведзены ў збліжэнне з карэннай Расіяй аднолькавымі сродкамі і ў адзін час"[19]. Віленскую, частку Гродзенскай, Мінскую губерню і Беластоцкую вобласць Асобы камітэт аднёсіў да найбольш апалячаных, таму ўводзіць там новую сістэму кіравання планавалася паступова і асцярожна. У астатніх жа губернях, дзе праваслаўе займала не апошняе месца, можна было дзейнічаць хутчэй.

У наступным у працэсе работы Камітэта заходніх губерняў з 1831 па 1848 гг. яго праграма па сутнасці не мянялася, толькі зрэдку карэкціравалася ў залежнасці ад знешніх абставін. Так, пасля канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830—1831 гг. і перадачы іх у казну Камітэт заходніх губерняў заняўся пытаннямі ўладкавання быту канфіскаваных сялян. Члены Камітэта спрабавалі не дапусціць да кіравання ў гэтых уладаннях прадстаўнікоў мясцовай польскай эліты і прыцягнуць на тэрыторыю Заходняга краю дваран з унутраных губерняў Расіі. У сувязі з гэтым Камітэт прымаў шэраг мер па перадачы канфіскаваных зямель у вотчыннае ўладанне на асобых правах 250 рускім чыноўнікам з дакладным вызначэннем павіннасцей сялян шляхам люстрацыі. Аднак жадаючых прыехаць у Заходні край было няшмат, а тыя нямногія, хто згаджаўся змяніць месца жыхарства, хутка ад'язджалі, пакідаючы свае маёнткі на ўтрыманне мясцовым польскім памешчыкам. Апошнія лічыліся ўпраўляючымі маёнткамі ці даверанымі асобамі гаспадара. Так у заходніх губернях паўсюдна з'явілася субарэнда. Пры аддачы ж казённымі палатамі канфіскаваных маёнткаў пасля правядзення таргоў у арэнднае ўтрыманне перавагу атрымлівалі не добранадзейныя прадстаўнікі, як таго патрабаваў урад, а тыя, хто быў гатовы больш заплаціць за арэнду. У 1837 г. у мэтах удасканалення кіравання Камітэт заходніх губерняў прапанаваў падзяліць усе канфіскаваныя ўладанні беларускіх губерняў на акругі і ўчасткі, у кожны з якіх прызначыць па аднаму камісару, падпарадкаванаму Казённай палаце. Аднак гэты праект не быў рэалізаваны, паколькі ў 1837 г. было ўтворана Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, якое занялося ўладкаваннем дзяржаўнай вёскі.

У 1839 г. сістэма аддачы казённых маёнткаў у арэнду пасля правядзення таргоў была заменена аддачай уладанняў у добранадзейную бескантрольную адміністрацыю на 12 гадоў. Для таго каб заахвоціць рускіх дваран браць казённыя маёнткі ў адміністрацыю пасля заканчэння 12-гадовага тэрміна ўпраўлення ім давалася права ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах, а таксама ў выпадку рэнтабельнасці маёнтка гарантавалася 30% (а не 10%) прыбытку ад даходаў уладання. Распаўсюдзіць рускае землеўладанне ў беларускіх губернях спрабавалі шляхам стварэння маяратаў, аднак намаганнямі міністра дзяржаўных маёмасцей П.Д.Кісялёва гэтая рэформа не была рэалізавана.

Пасля заснавання Міністэрства дзяржаўных маёмасцей Камітэт заходніх губерняў звярнуў увагу на паляпшэнне становішча памешчыцкіх сялян. У 1840 г. згодна рашэнню Камітэта ў маёнтках, аддадзеных у апеку за злоўжыванне памешчыцкай уладай, былі ўведзены інвентары. Паўсюднае ж увядзенне інвентароў у заходніх губернях пачалося ў 1844 г. і адбы-

Рэпазіторый БНТУ

валася па-рознаму. На Правабярэжнай Украіне пры актыўным удзеле кіеўскага генерал-губернатара Д.Г.Бібікава быў складзены інвентар па аднастайнай форме, якая ўключала ў сябе агульныя пастановы і нормы. У Беларусі і Літве інвентары складаліся асобна для кожнага маёнтка. У выніку ў Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай губернях інвентары ўводзіліся ў дзеянне ў 1845—1847 гг., а ў Магілёўскай і Віцебскай губернях гэты працэс зацягнуўся да 1857 г., калі пытанне страціла сваю актуальнасць у сувязі з падрыхтоўкай адмены прыгоннага права. Прычыны такога маруднага працэсу інвентарызацыі заключаліся, па-першае, у тэхнічных аспектах справы, а па-другое, у сабатаванні рэформы самімі памешчыкамі. Дваранства Віцебскай і Магілёўскай губерняў лічыла дадзенае пераўтварэнне настолькі эканамічна нявыгадным для сябе, што нават згаджалася на вызваленне сялян без зямлі.

На пасяджэннях Камітэта заходніх губерняў прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі неаднаразова ўздымалі пытанне пра перасяленне ў Беларусь, Літву і Правабярэжную Украіну рускіх сялян, якія павінны былі далучаць мясцовае насельніцтва да рускай мовы, рускіх звычаяў і “адданасці прастолу”. Аднак Камітэт вымушаны быў адмовіцца ад гэтай ідэі ў сілу аб’ектыўных абставін — адсутнасці свабодных зямель і недахопу дзяржаўнага фінансавання перасяленчай праграмы.

Члены Камітэта заходніх губерняў з’яўляліся прыхільнікамі працягу палітыкі “разбору” шляхты, якая пачалася на тэрыторыі далучаных зямель Рэчы Паспалітай яшчэ ў 1772 г. Ачышчэнне вышэйшага саслоўя ад “чужародных” элементаў праводзілася ў рамках агульнаімперскіх мерапрыемстваў на ўскраінах Расіі — Беларусі, Літве, Правабярэжнай Украіне, Царстве Польскім, Грузіі, Азербайджане. У Камітэце распрацоўваліся ўсе ўказы, якія тычыліся ўмоў кааптавання мясцовай эліты ў шэрагі спадчыннага дваранства і дэкласацыі тых, хто не здолеў даказаць сваё дваранскае паходжанне. Сам Камітэт не быў прыхільнікам радыкальных мер у адносінах да дваранства, таму тэрміны прадастаўлення дакументаў на дваранства неаднаразова пераносіліся. Асобам, якія не даказалі свайго дваранскага паходжання, дазвалялася паступаць як на ваенную, так і на грамадзянскую службу, каб у наступным можна было атрымаць дваранскі тытул згодна агульнаімперскаму заканадаўству. Тым не менш Камітэт выступаў за строгі кантроль над працэсам зацвярджэння ў дваранстве з боку дзяржавы. Згодна яго рашэнням дваранскія дэпутацкія сходы не маглі выдаваць пасведчанні аб дваранстве без зацвярджэння іх у Герольдыі, ствараліся камісіі па праверцы актавых і метрычных кніг, падлягалі рэвізіі і самі дваранскія дэпутацкія сходы.

Камітэт заходніх губерняў падтрымліваў урад у яго імкненні далучыць мясцовае дваранства да дзяржаўнай службы і спыніць практыку выбару на пасады асоб без чыноў. Для рускіх чыноўнікаў, якія накіроўваліся ў Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні, Камітэт прадугледзеў прадастаўленне льгот у выглядзе прагонаў і захаванне пенсій пры прызначэнні на службу. З 1837 г. дваран-католікаў, якія жадалі паступіць на чыноўніцкую службу, на пяць гадоў накіроўвалі ў цэнтральныя губерні для вывучэння рускай мовы.

Пасля выдання ўказа 1831 г. аб разборы шляхты ў заходніх губернях усе тыя, хто не даказаў свайго дваранскага паходжання, дзяліліся на дзве групы па месцу жыхарства: сельскія (аднадворцы) і гарадскія (грамадзяне) жыхары. Афармленнем іх юрыдычнага статусу займаўся Камітэт заходніх губерняў. Згодна ўказу, аднадворцы і грамадзяне звыш земскіх павіннасцей падвяргаліся спагнанню грашовага збору на ўтрыманне войскаў (падымны збор), адпраўленню воінскай павіннасці, а пазней абкладаліся яшчэ і віннай пошлінай. У 1834 г. Камітэт прыняў палажэнне, якое ўдакладняла пытанні кіравання аднадворцамі, парадак збору падаткаў і камплектавання арміі, аднак яно не было дасканала прадумана. У сувязі з гэтым у 1846 г. у Камітэце было прынята рашэнне раздзяліць кіраванне аднадворцамі паміж міністэрствамі. Аднадворцаў, якія жылі на казённых, уласных, грамадскіх землях, і ўсіх неаседлых падпарадкавалі Міністэрству дзяржаўных маёмасцей, а аднадворцаў, якія жылі на памешчыцкіх землях, — Міністэрству ўнутраных спраў.

Пасля паўстання 1830—1831 гг. расійскія ўлады ліквідавалі мясцовыя прававыя і судовыя асаблівасці Віцебскай і Магілёўскай губерняў, увялі на гэтай тэрыторыі агульнаімперскае заканадаўства. Асновай заканадаўства астатніх заходніх губерняў стаў выдадзены ў 1837 г. Заходні звод, які ўяўляў сінтэз палажэнняў Літоўскага Статута, норм магдэбургскага права, пастаноў сеймаў і быў адаптаваны да расійскіх законаў. Аднак яго дзеянне было нядоўгае. У 1840 г. па прапанове кіеўскага генерал-губернатара Д.Бібікава і па патрабаванню імператара Мікалая І расійскае заканадаўства было распаўсюджана на астатнія заходнія губерні. Практычна ўсе члены Камітэта заходніх губерняў лічылі гэту меру заўчаснай і не адабралі імкненняў імператара. Непасрэдным працягам указа 1840 г. стала пастанова гэтага ж года “Об именовании губерний белорусских и литовских каждою отдельно Витебскою, Могилёвскою, Виленскою и Гродненскою”, накіраваная на тое, каб выкараніць з афіцыйнага ўжытку назвы “беларускі” і “літоўскі”.

Асаблівая ўвага Камітэта была скіравана на ўдасканаленне паліцэйскага кіравання ў Беларусі. У структуры земскай паліцыі з’явіліся пасады ваенна-павятовых кіраўнікоў, у абавязкі якіх уваходзіў нагляд за захаваннем парадку ў паветах, раскрыццё злачынстваў, выкананне асабліва важных даручэнняў губернатара. Пасады ваенна-павятовых кіраўнікоў занялі прысланыя з унутраных губерняў адстаўныя рускія ваенныя ў званнях падпалкоўнікаў і палкоўнікаў. У 1843 г. Камітэт ліквідаваў пасады ваенна-павятовых кіраўнікоў, якіх да таго часу было па чатыры ў кожнай беларускай губерні.



Рэпазіторый БНТУ

У кампетэнцыю Камітэта ўваходзіла пытанне аб сістэме адукацыі ў заходніх губернях. Пасля закрыцця ў 1832 г. Віленскага універсітэта і канчатковай ліквідацыі Віленскай навучальнай акругі выхаваннем юнакоў павінны былі заняцца кадэцкія карпусы і шляхетныя пансіёны. У 1837 г. выйшаў указ аб заснаванні пры гімназіях і павятовых вучылішчах заходніх губерняў устаноў для адукацыі бедных дзяцей высакароднага звання. Найбольш таленавітых выпускнікоў гэтых устаноў накіроўвалі ва універсітэты Расійскай імперыі для далейшага навучання за кошт дзяржавы. Пасля атрымання адукацыі яны былі абавязаны праслужыць на грамадзянскай службе 8 гадоў. Прычым асобы, якія не належалі да праваслаўнага і ўніяцкага спавядання, першыя 5 гадоў праходзілі службу ў прысутных месцах вялікарасійскіх губерняў, а апошнія тры гады — у тых губернях, за кошт якіх яны навучаліся.

Камітэт заходніх губерняў неаднаразова выказваўся за змены ў сістэме жаночай адукацыі. Да сярэдзіны 1830-х гг. дзяўчынкі беларускіх губерняў атрымлівалі адукацыю альбо ў прыватных пансіёнах, альбо ў жаночых манастырах, у тым ліку каталіцкіх. Члены Камітэта прапаноўвалі перайсці да стварэння прыватных пансіёнаў, дзе маглі навучацца не толькі дваранкі. З пачатку 1840-х гг. пачалі ствараццa інстытуты шляхетных дзяўчат. Выказаная М.Мураўёвым ідэя аб стварэнні свецкай сістэмы адукацыі была адобрана Камітэтам і знайшла практычнае ўвасабленне. У 1830—1840-я гг. адбываўся працэс ліквідацыі і пераўтварэння ў свецкія навучальных устаноў, якія належалі манаскім ордэнам, каталіцкай і уніяцкай царквам, альбо перадача іх праваслаўнай царкве. У другой палове 1830-х гг. на тэрыторыі ўсіх заходніх губерняў у навучальных установах усіх тыпаў выкладанне пераводзілася на рускую мову, а польская мова выключалася з праграмы.

Пазіцыя членаў Камітэта ў галіне канфесіянальнай палітыкі супадала з асноўнымі прынцыпамі тэорыі афіцыйнай народнасці. Камітэт праводзіў курс на будаўніцтва новых праваслаўных цэркваў з прыцягненнем як дзяржаўных, так і прыватных сродкаў. Аднак мясцовыя дваране ў большасці сваёй з'яўляліся каталікамі і не былі зацікаўлены ў з'яўленні праваслаўных храмаў. У адносінах да рымска-каталіцкай царквы Камітэт заходніх губерняў праяўляў цярпімасць і не выступаў за радыкальнае скарачэнне колькасці касцёлаў. Абмежаванні тычыліся толькі распаўсюджвання каталіцкай веры на праваслаўнае насельніцтва. У значна большай ступені Камітэт быў зацікаўлены ў выпрацоўцы мерапрыемстваў па секулярызацыі часткі царкоўных зямель як каталіцкай, так і праваслаўнай царквы, падпарадкаванні яе дзяржаўнай уладзе.

Такім чынам, Камітэт заходніх губерняў з'яўляўся адным з тэрытарыяльных камітэтаў Расійскай імперыі, які павінен быў распрацоўваць асноўныя мерапрыемствы па кіраванню 9 заходнімі губернямі. Па сваёй структуры і пастаўленых задачах ён практычна нічым не адрозніваўся ад падобных камітэтаў — Сібірскага, Каўказскага, Камітэта па справах Царства Польскага. Перад Камітэтам заходніх губерняў стаяла задача далучыць ускраіны імперыі да расійскага ладу жыцця, садзейнічаць стварэнню адзінай прававой прасторы. Праграма дзейнасці Камітэта заходніх губерняў сфарміравалася па выніках работы яго папярэдніка — Асобага камітэта, а таксама шляхам прапаноў і праектаў па перабудове заходніх тэрыторый імперыі ад губернатараў і генерал-губернатараў. Ключавымі ў рабоце Камітэта сталі пытанні, звязаныя з саслоўнай палітыкай, увядзеннем на тэрыторыі Заходняга краю расійскага заканадаўства, рэарганізацыяй сістэмы адукацыі і ўрэгуляваннем канфесіянальнага жыцця.

[1] Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе: В 55 т. СПб., 1830—1884 гг. Т. I. № 465.

[2] [Николай I] Император Николай Павлович. Записки об укреплении западной границы. Апрель 1843 г. // Русская старина. 1884, № 6. С. 519.

[3] Гарбачова В.В. Паўстанне 1830—1831 гадоў на Беларусі. Мн., 2001. С. 143, 178.

[4] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей — РДГА). Ф. 1266, воп. 1, спр. 8, арк. 5.

[5] Исторические данные об образовании губерний, областей, градоначальств и других частей внутреннего управления империи с указанием высших чинов этого управления в хронологическом порядке по 1 ноября 1902 г. С. 108—109.

[6] РДГА. Ф. 1266, воп. 1, спр. 5, арк. 1—2.

[7] Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Ф. 380. Збор М.А. Корфа. № 1. Арк. 32.

[8] РДГА. Ф. 1266, воп. 1, спр. 3, арк. 16.

[9] Там жа. Арк. 17—17 адв.

[10] Там жа. Арк. 28.

[11] Там жа. Спр. 8, арк. 100.

[12] Там жа. Спр. 3, арк. 47—55.

[13] Середонин С.М. Исторический обзор деятельности комитета министров: В 2 т. СПб., 1902. Т. 2. Ч. 1. С. 58.

[14] Муравьев М.Н. Четыре политические записки о Северо-Западном крае. 1830 г., 1831 г., 1864 г., 1865 г. // Русский архив. 1885, № 6. С. 161—175.

[15] Там жа. С. 170.

[16] Долгоруков Н.А. Его величеству генерал-адъютанта князя Долгорукова всеподданнейшее донесение по управлению вверенными ему Виленскою и Гродненскою губерниями и областью Белостоцкою // Чтение в обществе истории и древностей российских. 1864, кн. 1. С. 180.

[17] Муравьев М.Н. Четыре политические записки о Северо-Западном крае. 1830 г., 1831 г., 1864 г., 1865 г. С. 175—186.

[18] РДГА. Ф. 1266, воп. 1, спр. 3, арк. 31—46.

[19] Там жа. Арк. 48.

Рэпазіторый БНТУ